Справаздача аб правядзенні ў межах «ШАГа»
адкрытага дыялогу «Я – часцінка маёй Беларусі»

24 верасня ў межах «ШАГа» праведзены адкрыты дыялог «Я – часцінка маёй Беларусі»

У фокусе абмеркавання: маральнасць, патрыятызм, ўсведамленне таго, што доўг кожнага грамадзяніна – быць Чалавекам; пазітыўнае адносіны да сябе і да навакольнага свету, захаванне нормаў і правілаў паводзін у грамадстве, актыўная грамадская пазіцыя. Падчас абмеркавання прытчы «Камень на дарозе», жыццёвай сітуацыі «Чалавеку неабходна дапамога», аналізу газетнага артыкула «Яна вярнулася да людзей» вучні разважалі над тым, у чым жа праяўляюцца лепшыя якасці чалавека, адкуль іх вытокі?



Справаздача аб правядзенні ў межах «ШАГа»
гадзіна зносін «Сям'я ў жыцці чалавека»

26 лістапада ў межах «ШАГа» для вучняў 6 класа праведзена гадзіна зносін «Сям'я ў жыцці чалавека».

У фокусе абмеркавання: сямейныя каштоўнасці, сямейныя традыцыі, роля сям'і ў фарміраванні гарманічнай асобы.

У выніку мерапрыемства вучні прыйшлі да высновы, што ў сямейным жыцці трэба лічыцца з думкамі, перакананнямі, інтарэсамі, пачуццямі блізкіх людзей. А каб захаваць шчаслівую сям'ю, неабходна ўмець уступаць адзін аднаму.

